Самапомач

Беларуская Коопэратыўна-Гаспадарчая Часопісь

Год II.	Вільня, Верасень 1933 г.	№ 11.


Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапамаччу.

Джордж РЭССЭЛЬ.
(*Ірляндзец*).



ЗЬМЕСТ № 11 (14).

BIEŁARUSKAJA ABECEDA.

Беларуская абэцэда.

A, a — A, a.	H, h — Г, г.	Ł ł, — Л, л.	S, š — Ш, ш.
B, b — Б, б.	Ch, ch — X, x.	M, m — M, м.	T, t — T, т.
C, c — Ц, ц.	I, i — I, i.	N, n — H, н.	U, u — У у.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	J, j — Й, й.	Ń, ń — НЬ, нь.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
Č, č — Ч, ч.	Ja, ja — Я, я.	O, o — O, o.	V, v — В, в.
D, d, — Д, д.	Je, je — E, e.	P, p — П, п.	Y, y — Ы, ы.
E, e — Э, э.	Ju, ju — Ю, ю	R, r - P, p.	Z, z — З, з.
F, f — Ф, ф.	K, k — K, к	S, s — C, c	Ž, ž — Ж, ж.
G, g — Г, г.	L, l — ЛЬ, ль.	Ś, ś — СЬ, сь.	Ź ź — ЗЬ, зь.

UVAHA: Pry niedaručeńni vypisanaj hazety z pošty treba zaraz-ža žadać vyjaśnieńnia na tej ža poščie. I tolki ŭ razie, kali b heta nie pamahło, treba zaraz-ža ab usioj spravie napisać u administracyju „Samapomačy". Padać pry hetym treba: kali (dakładna padać datu), čamu na jakoj poščie i jakoha numaru časopisi nia možna było atrymać. Biaz hetycch danych zamienny numar „Samapomačy" vysyłacca **nia budzie**.

Administracyja „Samapomačy".

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŬNA - HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod II.	Vilnia, Vierasień 1933 h.	Nr. 11 (14).

Niekooperatyŭnaja kooperacyja

Nia žart heta niejki, a samaja istotnaja praŭda. Dziesiatkom i sotkam kooperatyvaŭ na našych ziemlach možna z całaj słušnaściu pastavić zakid, što jany... niekooperatyŭnyja. A vynik? Nia-značny tolki pracent zasnavanych kooperatyvaŭ pracuje dalej: rešta pierastała isnavać z tym mamentam, jak adyšoŭ adzin — druhi čałaviek, na katorym apirałasia ŭsia praca ŭ kooperatyvie. Stacca tak musiła, bo choć kooperatyva vymahaje śviedamaści i supracoŭnictva ŭ s i c h jaje siabroŭ, siabry hetyja da pracy ŭciahnienymi adnak nia byli, pracy samoj i kooperatyŭnych zadačaŭ nie razumieli i tamu z lohkim sumleńniem kooperacyju pakinuli, jak pakidaje čałaviek kožnuju naahuł reč, katoraj nie paznaŭ, nie zrazumieŭ, da katoraj nia pryvyk.

Skaža ci padumaje mo' niechta, što „ciažka, kryzys, błahaja końjunktura". Voś-ža jakraz nie! Bo kooperatyvy, jak samadapamahovyja placoŭki, da taho i paklikany, kab šlacham samapomačy viali da vychadu z „ciažkich" časaŭ, z „kryzysu". A što datyča h. zv. „końjunktury", dyk usia biada siańnia nia hetulki ŭ joj, kolki ŭ struktury, u budovie jak siańniašniaha paradku, tak i prajektavanych šlachoŭ napravy. Sučasnaje pałažeńnie za ciažkaje, a ludzi paadzinočnyja — za słabyja, kab u rassypnuju, nie zhavaryŭšysia možna było dla budučyni zrabić niešta pavažnaje, tryvałkaje. A hetak adnak dziejecca.

I tut jak raz biada, bo nia tolki „staryja", ale i „novyja" kooperatyvy, zamiest kab ad samaha ŭžo pačatku ŭciahavacca ŭ kruh pracy hramadzkaj, samadapamahovaj, topčacca najčaściej prastarełymi ściežkami pryvatnickaha kramnictva. I kali prypomniać ab patrebie niejkaj tam suviazi, dyk chiba tolki pa toje, kab zrazu ž mieć sabie niejkuju z hetaha karyść. Chto i skul adnak hetu karyść dać maje? — ab hetym „hałava nie balić". A heta nie pahramadzku i tym bolš — nie pakooperatyŭnamu. Hetak daloka nia zajdziem.

Jak-ža tady być?—Užo zasnavanyja kooperatyvy musiać źviarnuć na šlach hramadzki, a nova zakładanyja musiać im iści ad samaha pačatku. Praktyka pakazała, što tryvały byt zapeŭnili sabie tyja tolki kooperatyvy, u katorych pobač i adnačasna z kamisijaj haspadarčaj, pracujuć i kamisii ideolohična-prapahandnyja. A na miejscy budzie ŭspomnić i ab pastanovie Revizyjnych Sajuzaŭ, što na budučyniu pradmietam ustavovaj revizyi budzie nia tolki kasa, buchhalteryja i naahuł vuzki haspadarčy, skazać-by – formalny bok, ale taksama i suma pracy pakładzienaj dla ŭśviedamleńnia svaich siabroŭ ab spravach kooperacyi. Mierkaj dla hetaha maje być miž inšym padličeńnie raspašyranych kooperatyŭnych drukaŭ — knižak i hazet. Krok hety musić dać dobryja vyniki i s k a s a v a ć soram našych časaŭ — n i e k o o p e r a t y ŭ n u j u k o o p e r a c y j u.

Jak cement macuje kamieńni ŭ ćviordy mur, tak dobraja kooperatyŭnaja presa viaža siabroŭ kooperatyvy ŭ niepieramožnuju całaść i siłu. — Čytajcie i pašyrajcie „SAMAPOMAČ"!

Nabaleŭšaja sprava.

Padniataje ŭ pradapošnim numary „Samapomačy" pytańnie ab kirunku školnaha i pazaškolnaha navučańnia i ŭzhadavańnia nia trapiła da pierakanańnia cenzuralnanych uładaŭ i tamu, zamiest stacca pradmietam razvažańniaŭ našych čytačoŭ, da ich zusim nie dastałasia. Školny hod adnak jašče ŭ pačatkach. Hlaniem-ža ŭ paru słovach, jakija jon nam niasie mahčymaści, jakija sumnivy i pažadańni.

Uciorłasia pierakanańnie, što škoła pavinna dać „intelihientaŭ." Dobra. Ale ci „intelihienščyna" moža być metaj sama ŭ sabie? Sama «intelihiencyja» jašče nie aznačaje, na što jana budzie ŭ žyćci škiravana. Nia tolki „intelihiencyja," ale i samaja vieda moža słužyć i sapraŭdy słuža nia tolki dabru, ale i złu: z aŭtamabilaŭ, fatahrafii, chemii, navat radia karystajuć ludzi nia tolki dla metaŭ česnych, ale i dla zvyčajnaha prastupstva. Štodziennaje žyćcio daje na heta biazlikaje mnostva prykładaŭ.

A znača sama ŭ sabie „intelihiencyja" metaj być nia moža. Musić tady škoła dać čałavieku niešta bolej, čym samaje tolki napampoŭvańnie viedaj. A hetym „niečym" jość abaviazak *źviazańnia budučaha intelihienta z žyćciom.* Bo ŭsia trahedyja ŭ tym, što pavodle ŭstareŭšaha našaha paniaćcia, intelihient i žyćcio, heta niazłučymyja paniaćci, heta ahoń i vada. I pakul tak budzie, pakul intelihient z školnaj łaŭki budzie ucialeśnieńniem samych tolki hornalotnych słoŭ, a nie čałaviekam dobraha čynu, datul jon budzie dla žyćcia nia tolki čužym, ale i varožym, bo staŭlajučy hetamu žyćciu štoraz novyja vymahańni, dać jamu ničoha nie patrapić.

Heta adna biada. Z druhoha boku adnak i žyćcio, pazbaŭlenaje intelihientnych pracaŭnikoŭ, nia moža być žyćciom poŭnym, sapraŭdnym. Kali ŭziać pad uvahu dźvie takija haliny žyćcia, jak promysieł i ziemlarobstva, dyk silniejšaja pazycyja pieršaha ŭ tym imienna, što jon patrapiŭ pryviazać da siabie niezraŭnana bolš sił intelihientnych, čymsia ziemlarobstva i što praz heta samaje sposaby pracy ŭ promyśle palepšyvajucca, udaskanalajucca z dnia na dzień, tady jak u ziemlarobstvie znachodzie jšče posłuch zastarełaje „pravila" haspadarki tak, jak haspadaryli „dziady." Vyraŭnać hetu kryvizmu adstałaści ziemlarobskaha žyćcia jość prostym i pieršym z pieršych abaviazkaŭ hetaj-ža ziemlarobskaj vioski. Jak? Prytrymańniem taje intelihiencyi, što vychodzić z viaskovych chataŭ, dla słužbaŭ taje-ž vioski. Na viosku musiać viarnucca tyja, što honiačysia za zarabotkami pierapoŭnili rady promysłu, narušajučy hetak roŭnavahu pamiž vytvorstvam i spažyćciom; dla pracy na vioscy musić pryhataŭlacca ŭ školach i užo padrastajučaja viaskovaja pieradusim moładź. Trudna pakazać dakładnyja sposaby takoha pryhatavańnia. Ahułam tolki možna skazać, što darosłamu čałavieku adčyniena daroha da mety praz samaadukacyju, a moładź musić być kiravana ŭ škoły, kursy, jakija pryhataŭlajuć da žyćcia p i e r a d u s i m u fachova-haspadarčych kirunkach: ziemlarobstva, koopieracyja, ramieśnictva.

Za šmat majem itelihientnych spažyŭcoŭ i za mała — intelihientnych vytvorcaŭ. Adviarnuć hetyja suadnosiny musić być pieršaj zadačaj kulturna-hramadzkaj pracy ŭ novym školnym hodzie nia tolki dla adzinak, ale i dla celych arhanizacyjaŭ, bo biezfachovy intelihient siahońnia u horšym pałažeńni, čymsia pieršaja z bierahu čornarabočaja siła. A pry dobraj pastanoŭcy spravy hety intelihient moža być asabista zdavolenym i dla hramadzianstva karysnym.

A. K.

Самапомач у жыватвораў.

Вучоныя людзі, ад увагі каторых ня скрыецца найменшая мушка, жучок ці які іншы жыватвор, даходзяць да перакананьня, што чалавеку ёсьць чаго ад іх навучыцца ў сэнсе дружнасьці і самапомачы. Чым цяжэй каму прыходзіцца жыць паасобку, тым хутчэй такая адзінка лучыцца з адзінкаю сабе падобнай, каб супольна ратавацца ад бяды, каб сабе ўзаемна памагчы.

Аб дружнасьці мурашак і пчол збольшага ведае хіба кожны. Мурашкі некалькіх суседніх гнёздаў гэтак добра знаюцца, што спраўляюць нешта падобнае да талакі, калі хочуць напр. паправіць свой мурашнік, або калі трэба супольна бараніцца ад нападу. Яшчэ большае пачуцьцё абавязку да самапомачы дагледзілі вучоныя ў трапічных тэрміт'аў, дзе той, хто адмовіцца ад помачы бліжняму, забіваецца.

А як-жа разьвіта пачуцьё самапомачы ў птушак?! Вераб'і, сарокі, вароны цэлай стаяй ганяюцца за каршуном, пакуль ня выганяць яго з „свае парафіі." Гурмам таксама шукаюць яны і спажывы.

Расейскі вучоны Северцов паказвае, як ён прыглядаўся да арла — белахвоста палюючага на спажыву: арол доўга кружыў высока ў паветры. Раптам выдаў з сябе адзін, другі, трэці клік, на каторы зьляцелася да яго ўверх яшчэ некалькі арлоў і тады ўсе разам рынуліся ўніз. Северцаў пацікавіўся, куды? — і пабачыў гэтых птушак над конскай падлай.

Вельмі „грамадзкія" і жураўлі: дзе толькі яны затрымаюцца, там усюды выстаўляюць варту. Тоесамае з папугаямі. А пэлікана, водную птушку з Афрыкі і Амэрыкі, ўадзіночку яшчэ здаецца ніхто і ніколі ня сустрэў: яны заўсёды жывуць у вялізных стаях, па 40 і 50 тысяч штук разам.

„III Paŭnočny Kirmaš i Lniarskaja Vystaŭka ŭ Vilni.“

Ad času, kali Vilenščyna z Navahradčynaj pačali nazyvacca „ziemlami paŭnočna-ŭschodnimi,“ u Vilni adbylisia dva kirmašy: 1-šy u 1928 h., a 2-hi — 1930 h. Arhanizacyja sioletniaha Kirmašu — III-ha — byla doŭha pytańniem niavyrašanym. I tolki nadvyška 70 tysiač złotych, jakija astalisia ad Kirmašu 1930 h., dy prystupleńnie da kirmašu vilenskaha Lniarskaha T-va, katoraje ŭ ramkach Kirmašu sarhanizavała lniarskuju vystaŭku, daviali kirmaš da skutku. Čas tryvańnia kirmašu-vystaŭki aznačany ad 26-ha žniŭnia da 10 ha vieraśnia ŭklučna. Razmach sioletniaha kirmašu, ŭ paraŭnańni z kirmašami 1930 i asabliva 1928 hodu, niezraŭnana mienšy. Usiudy lažyć ciažkaja piačać kryzysu. Tym nia mienš paasobnyja addziely kirmašu i asabliva vystaŭki varty ŭvahi.

Usia impreza kirmašu-vystaŭki sarhanizavana pa dumcy „adarvańnia ad kryzysu“ i to adarvańnia sobskimi siłami. Dziela hetaha vialiki nacisk pałožany ŭsiudy na pakaz rečaŭ produkavanych na miascoch, u samaj haspadarcy. Asabliva heta skazać treba ab Lniarskaj Vystaŭcy, dzie nahladna pradstaŭleny ŭvieś praces vytvorčaści, ad pryhataŭlańnia lnianoha siamieńnia i hleby da zasievu, praz dahlad zasiejenaha pola, žbirańnia lonu z pola, małaćbu, ścialeńnie, mačeńnie, trapańnie, časańnie, pražu, tkactva i ŭrešcie pakaz mody, — što možna z lonu vyrabić. Voś-ža jość tut usiakija pałotny, asabistaje, stałovaje i paścielnaje chuście (bializna), žanočaja, dziacinaja i mužčynskaja konfekcyja, usiakija pradmiety chatniaj i ziemlarobskaj haspadarki... Asobna pastaŭleny pavilon zastasavańnia lonu ŭ vojsku. U dapaŭnieńnie lniarskaj vystaŭki sarhanizavany jšče publičnyja referaty ab lniarstvie, abrazy ab lniarstvie pry pomačy mahičnaj latarni, česki lniarski film pakazvajučy cełу praces hadavańnia lonu na poli i ŭrešcie biasplatny lniarski kurs ad 1 da 10 vieraśnia pa 7—8 hadzin u dzień, ab hadavańni i dahladańni lonu, navucy pradziva i tkactva, acency, kotonizacyi (zbavoŭniańnie horšych sartoŭ vałakna) lonu i mnoha inšych viedamaściaŭ z haliny lniastva. Asabniakom stajać konkursy (27.VIII) 1. za najlepšuju lnianuju sałomu, 2—3. za najlepšaje česanaje vałakno (lnianaje i kanaplanaje), 4—5. za najcianiejšuju pražu i tkaninu samadziełu. Hetulki ab lonie.

Cikavy, choć mienšy, addzieł i druhoj haliny našaha narodnaha bahaćcia — rybactva. U boksach (zaharadkach) z dracianaj sietki ŭ haradzkich sažałkach pamieščany pradstaŭniki faŭny našych vodaŭ adkrytych (rek) i zamknionych (vazior i stavoŭ) u roznuju paru ichnaha žyćcia.

Jak lniarstva, tak i rybactva, heta naturalnaja „sol ziamli našaj,“ naša bahaćcie, naša budučynia. Bielaruskija ziemli pad Polščaj heta ž naturalnyja abšary lniarstva, a rybactva ŭ adnych tolki našych vaziorach maje ahramadnaje pole da popisu, bo tut-ža mieścicca naša „mora“ — Narač u 8.000 ha i cely rad inšych pa 6, 4 i 2 tys. ha, jak Spudy, Dryśviaty, Dzisna, Miadzieła. Tracina rybnaj pradukcyi ŭ sučasnaj Polščy prypadaje na Vilenščynu, a pradukcyja heta ŭ Polščy u 1931 h. pradstaŭlałasa hetak: z vazior 7 mil. kg. ryb, z rek — 2 mil. kg., z stavoŭ štučnych — 12 mil. kg.

Asobny pavilon zajmaje addziel pčalarski. Pradstaŭleny tut chronolohična postup udaskanaleńnia pčalarskaj haspadarki, ad kałodaŭ — karańnikoŭ da novačasnych vulloŭ ramovych. Usio heta raźmieščana ŭ haradzkim pa-Bernardynskim Sadzie.

Проста дзівугоднае пачуцьцё самапомачы пануе ў нашых птушак, якія на зіму змушаны адлятаць у цёплыя краі. Гэтак напр. вучоныя дасьледзілі, што качкі, гусі, перапёлкі, ластаўкі — усё гэта лаціць праз мора толькі ў грамадах, да таго ў грамадах зложаных часта з розных птушак; напр. жаўранкі (скаўронкі) заўсяды лятуць з буслами (бацянамі), або жураўлямі. Мала таго: некаторыя цьвердзяць, хоць гэта йшчэ навукова і не даказана, што калі малыя жаўранкі перамучацца доўгім лётам над морам, дык сядаюць на плечы жураўлёў і адпачываюць.

Можна гэткіх прыкладаў самапомачы з царства жыватвораў прывясьці бязлікае мноства. І ўсе яны бяззьменна паказваюць, як глыбака гэтыя жыватворы маюць закарэненае зразуменьне, што толькі ў грамадзе сіла. Толькі гэтакім спосабам можа кожны сам перажыць і другому жыць паможа: карысьць вачавідная і бяссумніўная.

Калі зважыць усё гэта, а таксама што чалавек, маючы розум, часта паступае горш ад „дзікага стварэньня,“ якое розуму ня мае, мімаволна закрадаецца пытаньне: нашто чалавек ужывае даны сабе розум? Ці не на тое, каб псуць натуру, ад прыроды добрую і правамэтную? Пастунці чалавека часта паказваюць, што так.

Чалавек мусіць розумам дайсьці да канешнасьці самапомачы, калі ня хоча дацца выперадзіць неразумным жыватворам. Іначай пагражае яму нямінучая загуба.

А. Коўзан.

Lesnaja haspadarka i samo ziemlarobstva ścisłaje pradstaŭlajecca značna słabiej. Da ažyŭleńnia addziełu hadaŭlanaha pradznačana vystaŭka koniaŭ, praznačanaja na apošnija dni vystaŭki, h. zn. 9 i 10 vieraśnia.

* * *

Nie zatrymlivajučysia daŭžej nad apisańniem cełaha kirmašu-vystaŭki, varta jšče raz z asablivym naciskam zaznačyć jahonuju puciavodnuju dumku, krajovuju samavystarčalnaść. Jość heta publičnaje pryznańnie pamyłak 15-cihadovaha centralistyčnaha hurra—patryjatyzmu. I što moža asablivaj zasłuhoŭvuje ŭvahi — tyja-ž ludzi, jakija ŭ svoj čas aružnaj siłaj zacirali samabytnaść našych ziamiel, siahońnia robiać vid, što starajucca z usiej siły viarnucca tudy, skul vyšli, staviačy vyrazny klič: „Ziamla naša musić nas apranuć i vykarmić!“

Ale! Ziamla n a š a,—a niačužaja!—musić nas vykarmić. I bieznadziejnym marnatraŭcam jość toj, chto dla praminajučych čužych błyskotkaŭ pakidaje svoj rodny zahon: budzie tam błukacca ŭ paniaviercy, až pokul zatužyć i ŭznoŭ viernieccá, bo „milejšy svoj kałok, jak čužaja klamka.“

A. Vilenčuk.

Kooperatyŭnyja naviny.

— A h u l n y S c h o d S i a b r o ŭ B i e ł a r u s k a j K r e d y t o v a j K o o p e r a t y v y (b Biełaruski Kooperatyŭny Bank) u Vilni adbudziecca ŭ niadzielu 10 vieraśnia s. h ŭ ułasnym pamieškańni: Vilnia, Karaleŭskaja vul. 3—8. Pačatak schodu a hadz. 15-aj.

— U K o o p e r a t y ŭ n a j R a d z i e, najvyšejšaj nadzorčaj instytucyi nad kooperacyjaj ŭ Polščy, źmienieny staršynia Rady J. Kwieciński, jaki na hetym stanoviščy pratryvaŭ ad 1920 h Na miesca Kwiecinskaha naznačany radnik ministerstva skarbu Ksavery Pomijalski. — Maje heta biazumoŭnuju suviaź z projektavanaj źmienaj kooperatyŭnaha zakonu z 1920—23 h.

— K o o p e r a t y ŭ n a j a š k l a r n i a zasnavałasia ŭ Žoŭkvie (Uschodniaja Haliččyna). Zasnavali jaje sami rabotniki i čynoŭniki zamknionaj šklarni (huty) pryvatnaj. Koratka—dzie nie zmahło ŭtrymacca pradpryjemstva pryvatnaje, paŭstała takoje ž pradpryjemstva kooperatyŭnaje. Dalšy los hetaj novaj kooperatyŭnaj placoŭki biazumoŭna budzie vielmi cikavym: utrymajecca ci nie?

L i č b o v y s t a n k o o p e r a c y i ŭ P o l š č y. Na 1-je studnia siol. h. ličbovy stan kooperacyi (polskaj i niapolskaj) ŭ Polščy, pavodle padličeńnia Dziaržaŭnaj Kooperatyŭnaj Rady, pradstaŭlaŭsia hetak: Ahulny lik usich kooperatyvaŭ (sajuznych i „dzikich“) vynosiŭ 18.668. Za 1932 h. drybyło 704 kooperatyvy, ubyło — 753, znača ahułam ubyło 49 kooperatyvaŭ Usie kooperatyvy pavodle kirunku svajoj pracy dzialilisia nastupnym paradkam:

I. kooperatyvy spažyvieckija — 4.307, u hetym liku čysta spažyvieckich — 3.179, pamieškanicvych i budaŭlanych — 950 i ŭzajemnaha zaspakajańnia inšych patreb — 178;

II Kooperatyvy aščadna pazyčkovyja — 7.012, u hetym liku ahulna-aščadnickich — 2,264, ziemlarobskich typu Raiffeisen-Stefczyk — 4.[illegible]84, uradaŭcaŭ i pracaŭnikoŭ — 256, inšyja — 1[illegible]8.

III Kooperatyvy ziemlarobskija — 6.311, u hetym liku kooperatyvy dziela ahulnaha zakupu i zbytu — 3 892, spec. zak. i zbytu—154, małačarskija 1989, inšyja vytvorčyja — 108, pamacničyja — 168;

IV. Kooperatyvy ramieśnickija (syrec, mahazynavańnie, mašynovyja i h. d.) — 155;

V Kooperatyvy rabotnikaŭ i pracaŭnikoŭ: vytvorčyja rabotnikaŭ i batrakoŭ — 152, koop. pracy — 104;

VI Kooperatyvy inšyja (pradpryjemcaŭ) — 627, pramysłovyja — 104, handlovyja — 303, roznyja — 220.

Dakładnaha stanu kooperacyi ŭ Polščy hetyja ličby adnak nie pradstaŭlajuć. Ličby hetyja tolki oryjentacyjnyja Šmat u hetym liku padana kooperatyvaŭ abo ŭžo niačynnych, a tolki nia vykasavanych z rejestru, a taksama takich, katoryja byccam i žyvuć, ale ŭžo „niadužyja.“ — Jašče cikaviejšaja była-b statystyka kooperatyvaŭ na ziemlach biełaruskich, ale ab hetym tymčasam cicha.

Сельская гаспадарка.

Баранеце покуль час!

Прычынай леташняга неўраджаю, які ў Саветах, паводле газэтных вестак, давёў сёлета да масавага голаду, была між іншым пошасьць ржы (puccinia graminis i інш.) на збажжавінах, як пшаніца, жыта, авёс і г. д. Ня першы гэта і не апошні выпадак, калі ржа, асабліва ў мокрае лета, нішчыць засевы і гэтым самым прыводзіць голад. Можна ад гэтага няшчасьця аднак усьцерагчыся і то вельмі танным спосабам. Трэба толькі аб гэтым загадзя падумаць, перад сяўбой, і сяўбовае насеньне ў час байцаваць, г. зн. затруваць на ім заразныя пачаткі ржы.

Ржа збажжовая (*puccinia graminis*) належыць да шкоднікаў г. зв. двубытных, г. зн. яна, побач з збожжам, разьвіваецца яшчэ і на іншай расьціне (ржа разьвіваецца на бэрбэрысе) і дзеля таго ня зьнішчыўшы ў полі такога заражанага бэрбэрысу, ня можна і думаць аб зьнішчэньні ржы на збажжавінах. Выглядае ржа як рудыя рыскі, або чорныя плямы на сьцяблёх, лістох і каласох, выпаўненыя мяккім парашком, быццам пылам.

Другім вельмі небясьпечным шкоднікам нашых збажжавін зьяўляецца гэтак званая сьнець, якая патрапіць зьнішчыць палову і нават дзьве трацiны ўраджаю. У каласох затрутай збажжавіны замест зерня астаюцца толькі кучкі да сажы падобнага пылу і рэшткі мякіны. Ёсьць вельмі шмат сартоў сьнеці, якія ў засадзе аднак дзеляцца на два віды: *Ustilago i Tilletia.*

Найлепшым спосабам абароны супроць розных сьнецяў і супроць ржы, ёсьць байцаваньне сяўбовага зерня перад пасевам, гэта знача затруваньне на гэтым зярняці ўсякіх хваробвых зародкаў ці то сьнеці, ці

ржы, ці якой яшчэ іншай пошасьці. Спосабаў байцаваньня ёсьць у засадзе два: мокры (стары) і сухі (навейшы). Як да мокрага, так і да сухога байцаваньня ўжываюць розных хэмічных прэпаратаў (парашкоў), дзейнасьць каторых палягае на тым, што яны забіваюць на зярняці хвараблівыя зародкі.

Да байцаваньня на мокра ўжываецца найчасьцей раствор сіняга каменя ($CuSO_4$), або формаліну. Раствор сіняга каменя прыгатаўляецца гэтак: ½ кілё каменя распускаецца ў 100 літрах вады.*) Насеннае збожжа ўсыпаецца ў гэту ваду і дакладна перамешваецца, а ўсе тое, што ўсплыве наверх — зьліваецца. Збожжа мокне гэтак праз ноч (8—10 гадзін часу). Дзеля таго што сіні камень можа пашкодзіць і самым зярнятам, асабліва калі яны абабітыя, ці паламаныя, радзяць вынятае з гэткага раствору збожжа прамыць яшчэ зараз-жа ў вапенным малацэ (1 кілё гашанай вапны на 100 літраў вады) і пасьля ўсё дакладна прасушыць, рассыпаўшы на таку ці на іншым правеўным месцы.

Формалін гэта водны раствор формальдэгіду. Прадаецца ў аптэках звычайна разведзены да 40 проц. Чверць літра гэткага раствору (40 проц.) мяшаецца ў 100 літрах вады (ні больш ні менш!). У гэткім растворы замочываецца сяўбовае зерне роўна на 15 мінут, рассыпаецца на чыстым таку, ці падлозе, каб прасохла, узноў зьбіраецца ў чыстыя, прадтым у тым жа формаліне дэзынфікаваныя мяшкі і рассяваецца. Байцаваць сяўбу формалінам трэба прад самым засевам, бо ад даўжэйшага ляжаньня байцаванае зерне можа сапсавацца.

Да мокрага байцаваньня ўжываецца апрача таго йшчэ і аддумысьля прыгатаваныя парашкі такія, як Uspulun і інш.

Апрача мокрага байцаваньня знаюць яшчэ байцаваньне сухое, якое палягае на тым, што сяўба разам з парашком усыпаецца ў шчыльную судзіну (бачонак) і старанна перамешваецца, каб кожнае зярнятка абвілося ценькім слоем парашку, які ня толькі заб'е хвараблівыя зародкі на зярняці, але і гэткія-ж зародкі ў зямлі. Сухое байцаваньне яшчэ мала пашырана, але пашыраецца яно штораз больш.

С. Яновіч.

*) У вядрэ 12 літраў.

Зьбірайце зярняты дзічак!

Бязлікае мноства ўсякага дабра вымыкаецца з рук нашага чалавека дзеля таго толькі, што ён нясьведамы вартасьці і спосабу застасаваньня тых бязлікіх, на пагляд дробных і непаказных магчымасьцяў, якіх поўна ў штодзенным ягоным жыцьці. Выкарыстаць гэтыя магчымасьці, значыць знайсьці ключ да свайго дабрабыту. Вось-жа адной з такіх нязнаных для агулу «магчымасьцяў» зьяўляюцца зярняты з пладоў такіх дзічак, як яблыні, йгрушы, сьлівы і г. д.

Гэтых зярнят поўна ўсюды і яны аднак валяюцца і гінуць бескарысна. А трэба ведаць, што з гэтых якраз зярнят здольны вырасьці найлепшыя, найсільнейшыя падкладкі пад будучыя ўшчэпы і самыя пладовыя дрэвы. Дык хай жа ня згіне дарма ніводная дзікая ці нават мала палепшаная йгрушка, ніводзін яблык! Малая з іх была карысьць спажыўная, дапоўніць яе мусіць карысьць гадаўляная. Як гэта праводзіць?

Перадусім ядучы такія дзічкі, калі толькі яны сьпелыя, ня трэба іхных зярнят марнаваць, але старанна, зярнё да зярняці, зьбіраць. А нават калі-б так сталася, што дзічкі загніюцца, дык зярнё ўсё роўна можа і сапраўды бывае добрым. Больш таго: калі-б можна быко нейдзе дастаць плады— дзічкі сумысьля на развод, дык дастаць з іх зярняты найлягчэй так, што самыя плады (йгрушкі, яблыкі) накладаюць у кучкі, каб яны загніліся. Тады іх расьціскаюць, а самыя зярняты выпаласківаюць вадой.

Так ці гэтак атрыманыя зярняты (тое самае і з „костачкамі" сьлівак, вішняў) трэба злёгка прасушыць, разлажыўшы іх у правеўным месцы (але не на сонцы!) на стале на дні тры часу. Пасьля гэтага зерне бывае ўжо гатовым да засеву; звычайна аднак ня сеецца, а пакідаецца да вясны, бо ўвосені засеенае зерне падлягае шмат якім небясьпекам. Між іншым на такое зерне вельмі ласы мышы; а ў нас да таго небясьпечны і маразы. Дзеля таго звычайна сяўбу адкладаюць да вясны, а самае зерне адпаведна перахоўвуюць. Калі-ж бы нехта хацеў абавязкава сеяць дзічкі ўвосені, дык мусіў-бы самае семя дзічкі прад сяўбой ад мышэй добра абсыпаць аптэчным парашком мінія (на кілё зярнят 20 грам мінія).

Перахоўваньне зярнят праз зіму да вясны выглядае гэтак: у скрынку ці якую йнакшую судзіну з прадзюраўленым дном сыплецца пласт тоўчанага драўлянага вугля, ці пяску да грубіні двух пальцаў; на гэта сыплецца пласт зярнят дзічак да грубіні аднаго пальца, тады вогкі пясок на грубіню двух пальцаў, узноў зярняты — на адзін палец і г. д., аж покуль усё з верху ня прысыплецца пластом вогкага пяску, а на яго йшчэ — ялаўцовымі калючкамі (ад мышэй). Покуль няма маразоў, гэткую скрынку трымаюць у халаднавым, цёмным месцы, бясьпечным ад мышэй. Час ад часу трэба пры гэтым паглядзець, ці ня высах зусім пясок і калі так, дык трэба яго зараз-жа паліць вадой.— Цесна перад маразамі ўстаўляецца скрынка з зернем у загадзя прыгатаваную яму на такую глыбку, гдзе б не дасягаў мароз (1 м.), аб стаўляецца ялаўцовымі і яловымі лапкамі (не саломай!) і закопываецца.

Засяваюцца дзічкі вясной на глебе дакладна вычышчанай з пырніку, лебяды

яшчэ з восені добра выгнаенай. Успульхненую ральлю раўнуюць, праводзяць роўныя няглыбокія, бо толькі ў 4 см. раўкі і ў іх густа засяваюць дзічкі. Раўкі разьмяшчаюцца на адлегласьць больш-менш 15 см., засееныя зярняты прыкрываюцца загадзя прыгатаваным чорназёмам, каторы пасьля дошчачкай лёгка йшчэ прыбіваецца.

Гэтак засееныя дзічкі хутка пачынаюць усходзіць і тады прыходзіць час першага перасаджываньня, або школкаваньня. Робіцца яно па тое, каб змусіць маладую ўжо дзічку пускаць больш каранёў ушырку, замест дагэтуляшняга аднаго толькі караня ўглыбку. Работа выглядае гэтак. Загадзя трэба прыгатаваць градку добрай, чыстай зямлі, на 50 см. (дзьве лапаты) добра перакапаць і пакінуць яе, каб зляглася. Выраўнаваўшы верх гэткай градкі, трэба на ёй шнуром зрабіць лініі—з поўначы на поўдзень— ад сябе адлеглыя ўжо на якіх 30—50 см., на каторыя ў родок і садзяцца асобныя калівы дзічак у ямкі, зробленыя калочкам, адно ад другога на якіх таксама 30-40-50 см.; чым лепшая зямля, тым гусьцей і наадварот. - Калі дзічкі—высеўкі ўжо ўзойдуюць і пакажуць першыя два лісткі, тады нечакаючы трэба іх перасаджываць. Малой лапаткай падважываецца часьць засеенага радка, скора—каб не павялі—але асьцярожна выбіраецца па аднаму каліву дзічкі, пазногцем ці нажом абрываецца на адну трацiну глаўны корань і зараз-жа садзіцца ў ямку ды добра абцісківаецца зямлёй. Як глыбака садзіць, гэта залежыць ад таго, ці ўскапаная зямля ўжо мела час асесьці, ці йшчэ не: там, дзе зямля ўжо асела, ня трэба садзіць высеўку глыбей, як яна сядзела на першай градцы, прад перасаджваньнем. Калі ж зямля йшчэ не асела, дык трэба садзіць глыбей (як капусту), каб пасьля саджаная дзічка не „павылазіла."Само перасаджваньне найлепш рабіць у пахмурны дзень. Калі-ж пагода стаіць добрая, а перасаджваць ужо пара, бо йнакш каліўцы дзічак здзеравянеюць, дык тады такую работу трэба рабіць прынамся пад вечар, а самую градку з перасаджанымі дзічкамі— пазакрываць галузкамі ялінкі ці ялаўцу, каб не прыпякло сонца.

Гэтак перасаджаную дзічку ня можна пакідаць без дагляду: трэба палоць градку ад усякага пустазельля, палівацъ, 3—4 разы матыкаваць зямную скарынку між радкоў, а прыкрыцьцё ад сонца можна зьняць тады толькі, як перасаджаныя каліўцы пусьцяць ужо новыя лісткі (праз 3—4 тыдні). Каб рост прысьпяшыць, да вады да паліваньня двойчы ў тыдзень дадаецца адна трэцяя часьць мачавой жыжкі, або разведзенага каравячага гною. Мяйсцамі практыкуецца замест паліваньня, перакладаньне радкоў дзічак звычайным гноем па версе: мае гэта аўтоматычна бараніць самыя дзічкі ад лішняй сьпякоты ў пагодныя дні і карміць іх выпаласківаным гноем падчас дажджоў. — Што лепш — хай выпрабуюць самі гаспадары-садаводы.

Гэтак дагляданыя дзічкі праз лета звычайна дасягаюць ужо грубіні алаўка, а нават пальца, асабліва яблыні і чарэшні; сьлівы і йгрушы растуць значна вальней. Слаба вырасшыя дзічкі яблыні і чарэшні, а таксама ўсе звычайна йгрушы ды сьлівы пакідаюцца на градцы йшчэ на другі год. Затое добра разьвітыя дзічкі (яблыні, чарэшні, а пры цёплым вогкім леце — і йгрушы выкопываюцца ўзноў, зразу абрываюцца з лістоў, сартуюцца, вяжуцца ў пучкі па 10, 50, 100 штук і прысыпаюцца зямлёй да часу паўторнага, другога перасаджваньня (школкаваньня). Слабейшыя дзічкі можна пакідаць на градцы, або і перасаджываць, але на такой самой адлегласьці ад сябе, як і ў годзе папярэднім. Толькі двойчы перасаджваныя дзічкі бываюць здольнымі ўжо да прышчэпліваньня, якое найлепш праводзіць вясной (м-ц красавік).

Трэба пры канцы зазначыць, што пры надбытку працоўных рук на вёсцы і вялікім попыце на дзічкі з боку самых фаховых садоўнікаў, гадаваньне добрых дзічак можа вельмі добра аплачывацца.

В. Р.

Як абхадзіцца з садовінай*).

Рэдка дзе апраўдываецца так прыказка што „даў Бог цяля—няма хлява,"як у нашым садаводзтве.Поўна ўсюды,здавалася-б, усякай садовіны, але рынкі завалены садовінай чужой. Як гэта, чаму? А проста таму, што ў большасьці выпадкаў наш чалавек хоць і патрапіць садовіну выгадаваць, то-ж ня ўмее аднак яе прыгатаваць для рынку. А гэта ў садаводзтве было і ёсьць важным заўсёды. Трэба дзеля гэтага зазнаёміцца з найгалаўнейшымі прынамся працамі прыгатаньня садовіны на рынак. Пачнём ад сартоў летніх.

Перадусім калі пара здымаць садовіну з пня?

Такія летнія плады, як вішні, сьліўкі, а таксама і ягады зьбіраюцца тады толькі, як яны ўжо зусім сьпелыя. Інакш аднак стаіць справа з такімі напр. летнімі яблыкамі, і асабліва йгрушкамі, каторых ня можна цалкам сьпяліць на дрэве, бо страцяць сачыстасьць і будуць мучнатымі: іх трэба здымаць з дрэва за тыдзень — паўтара і болей перад уласьцівай (фізіолёгічнай) сьпеласьцяй. Само здыманьне ўсякіх пладоў мусіць адбывацца заўсяды за суха і тым асьцеражней, чым далікатнейшыя сарты садовіны. „Трасьці" йгрушкі—яблыкі магчыма хіба толькі тады, калі яны прызначаны да беспасярэдняга спажыцьця, або пераробкі; ды і то трэба

*) Пад словам „садовіна" разумеецца ўсё тое, што абымае слова „плод" або чужое слова „фрукт," а знача: яблык, ігрушка, сьліўка і г. д.

памятаць, што гэтым калечацца дрэвы. Нагул-жа ўзята садовіну з дрэва трэба здымаць рукамі, а пры сартаваньні, пакаваньні і асабліва перавозе трэба стасаваць як найдалей пасуненую асьцярожнасьць.

Ранна—васеньнія сарты яблыкаў і йгрушак зьбіраюцца ў другой палове верасьня, позныя — ў першай палове кастрычніка і зімовыя—у другой палове таго-ж кастрычніка. Заўважана пры гэтым, што чым пазьней вісяць на дрэве зімовыя сарты садовіны, тым лепш пасьля перахоўвуюцца і ня вянуць. Прымаразкі невялікія (да—2°C) садовіне на дрэве ня шкодзяць, а толькі прысьпяшаюць пасьля дасьпяваньне, што ў ігрушак асабліва пажаданым ня ёсьць: ігрушкі ляжаць датуль добрымі, пакуль не дасьпеюць. Сабраную садовіну раскладаюць у сухім, але правеўным месцы і праз тры-чатыры дні робяць першую пераборку. Аканчальную пераборку можна рабіць толькі цераз 2 тыдні, бо тады толькі пакажуцца ўсе недахопы і сьляды пабіцьця садовіны. Асобна аддзяляюцца пры гэтым вялікія, чыстыя і цэлыя штукі, асобна меншыя чыстыя і большыя з меншымі плямкамі, асобна ўрэшце — большыя з плямамі і дробныя.

Цяпер паўстае пытаньне, як і куды гэта падзець?

Што можна—збываецца зараз-жа. Пакідаць на перахаваньне можна толькі тавар першай якасьці: чысты, здаровы і цэлы. Ды і то трэба ведаць, што да м-ца лютага траціцца на вазе садовіны 4—6 проц., а гніе таксама 10 проц. — Перахоўвуецца садовіна або вольна на паліцах, або зложаная ў бочках, ці скрынках і кошыках. Добрыя сарты садовіны найлепш разлажыць на паліцах і раз на тыдзень рабіць перагляд. Паліцы гэткія памяшчаюцца ў адумысловых каморах, якія мусяць адказваць наступным вымогам: 1. мець сталую тэмпэратуру каля 6°C (ня ніжэй 0° і ня вышэй 8°C.), 2. быць цьмянымі, бо сьвятло прысьпяшае дасьпяваньне, 3. часта ветраць, асабліва спачатку, аж да маразоў, трэба вакно трымаць адчыненым, 4. паветра бяз запахаў па чымсь пастараньнім. Ад надбытку вогкасьці ў каморы садовіна плясьнее, а ад недастатку—вяне. У першым выпадку радзяць у камору расстаўляць хлёрыд вапенаты ($CaCl_2$), а ў другім — ваду. Правогчаны хлёрыд абнаўляецца звычайным высушваньнем.

У каго ёсьць з'усюль закрытыя вышкі (чардак) над жылым памешканьнем, там можна таксама трымаць садовіну ў малых грамадках: прад маразамі яе трэба абакрыць саламянымі матамі. Захопленай марозам садовіны ні ў якім выпадку ня можна ўносіць ў жылое памешканьне, як ня можна такой садовіны, покуль не адмерзьне, нават браць голай рукой—згніе: найвышэй можна і трэба накрыць яе саломай (найлепш—матай), пакуль сама сабой „не адойдзе" і тады прысьпяшыць ужо ейнае спажыцьцё.

Можна таксама перахоўваць добрыя сарты яблык і йгрушак у бочках і скрынках. Ня можна, пэўна-ж, пры гэтым ссыпаць садовіны абы як, але трэба на дно пасыпаць: пласт сухога пяску, ці яшчэ лепш — мелкага сухога торфу, на гэта паклаьсці адзін рад садовіны (яблыкі, ігрушкі), узноў торф, узноў садовіна і г. д. Гэтакія бочкі з садавінай можна трымаць у каморы, на вышках, у гумне.

Пакаваньне садовіны на рынак — гэта адна асобная стацьця. Коратка: калі хто хоча атрымаць добрыя грошы за садовіну, мусіць яе пакаваць в. старанна, кожную штуку паасобку завіваючы ў чыстую мяккую паперу (недрукаваную ані пісаную!) і складаць так, каб ані парушылася. Бакі, дно і верх скрынкі высьцілаецца мяккім сухім мохам. Хлапатлівая гэта справа, але аплачываецца: заграніца гэта робіць, нашы-ж людзі за гэта плацяць вялікія грошы. — Ці-ж ня варта за гэта „зачапіць" нашы безработныя рукі на вёсцы і мець з гэтага адпаведны даход?

В. Р.

Перад зімоўкай пчол.

Пчаляр сёлета разьвітаецца з летам бяз жалю: можа за год дачакаецца лепшага лета і тады палатае сёлетні недабор. Але для належнага перазімаваньня пчол трэба адпаведна іх да гэтага прыгатаваць, бо найчасьцейшай прычынай адміраньня пчол узімку бывае не мароз, не нястача нават корму (мёду), але неадпаведнае улажэньне зімовага гнязда. А вінават тут бывае толькі сам чалавек, які падчас васеньніх лазьбінаў (падбіраньня мёду) прыгатаванае самымі пчоламі гняздо распора, а належна саставіць яго пасьля ня ўмее, або аб гэтым і зусім ня турбуецца.

Час складаньня зімовага гнязда для пчол — зараз пасьля заканчэньня мёдазбору, калі пчолка вяртае з поля жвава і лёгка і выганяе з вуля трутня. Ніякім чынам (хіба ў зімаховах —вулёўнях) ня можна ўжо рухаць гнязда, калі пчолы самі яго пакітуюць.

Варункі добрага перазімаваньня пчол наступныя:

1. Пень мусіць быць сільным, г. зн. пчолы мусяць абсядаць на чорна прынамся 4 рамкі. Іначай яго трэба злучыць з другім. Сільны пень абсядае 7—9 і нават 10 рамак;

2. павінен мець добрую матку, аб чым сьведчыць суцэльны і крыты чэр у плястрох;

3. павінен мець досыць і добра разьмешчанага мёду: для пчол зімуючых,надворы —ня менш 12 кілё, у вулёўні—10 кілё. Меншы рой патрэбаваў-бы, здаецца, менш мёду: але-ж гэткі рой патрэбуе больш мёду на самасаграваньне, што адно на другое выходзіць. Поўная рамка напр. з вуля Дадан-Блята, або і Лявіцкага — важыць 3 з паловай

кілё. Мёд у рамцы мусіць быць разьмешчаны зьверху ўніз, бо зімуючая пчала пасувацца можа зьнізу толькі ўверх, або ўбок: уніз —ніколі! Самыя дольнія часьці плястроў мусяць быць роўнымі і парожнымі ад мёду.

Мёд у рамках мусіць быць зашыты (запячатаны), бо йнакш квасьнее, а ад гэтага пасьля пчолы хварэюць.

Што датыча разьмяшчэньня самых рамак у гнязьдзе, дык яно мусіць кіравацца рухам пчол у паасобных відах вульлёў. А гэты рух адбываецца ў стаякох (Дадан-Блят з надстаўкай) — зьнізу ўверх, у паўлежакох (Дадан Блят) — спачатку ўздоўж і пасьля ўпоперак, а ў лежакох (Лявіцкі)—спачатку зьнізу ўверх, а пасьля ўпоперак. Стасоўна да гэтага: у стаякох павінен быць наверсе—мёд, над ім — чэр, а пад чэрам—сухая вуза. З бакоў чэру даецца па рамцы мёду.

У паўлежакох у сярэдзіне гнязда стаўляюцца рамкі з мёдам і чэрам, хоць галоўны магазын з мёдам павінен быць з аднаго боку вульля.—У лежакох запас мёду знаходзіцца мусіць з аднаго болу гнязда, праціўлежнага ад лёткі.

Калі галодны год, дык найпазьней да паловы верасьня можна пчолы падкармліваць. Куплёнага мёду да гэтага аднак трэба высьцерагацца. Лепш ужываць цукар (1 кілё цукру на $^3/_4$ літра цёплай вады). Захаваць пры гэтым трэба чыстасьць, бо пчолы прывучацца да крадзежы.

4. Гняздо павінна быць не за малое, але і не завялікае. Лёткі трэба на гэтулькі зьменшыць, каб праз іх маглі прайсьці адначасна найвышэй толькі дзьве пчалы.

Аб стаўляньні вульлёў на зіму — наступным разам.

а. к.

Запытаньні і адказы.

Прашу даць адказ на наступныя патаньні:

1. Чым і як прышчэпліваць глебу перад першай сяўбой соі?
2. Як бараніцца ад напасьці на пасеўныя полі малой зьвярынкі, якую ў нас называюць п о д т а ч а й? Падобна яна да рака, толькі крыху меншая, жаўтавая, рые на полі цэлыя калідоры і гэтым нішчыць засевы. Засеенае поле выглядае пасьля гэтага быццам збаранаванае граблямі.
3. Як сеяць проса.
4. У адным месцы кажуць абрываць цьвет на бульбе, у іншым — пакідаць: як-жа ў канцы-канцоў лепш?

С. С. — Слонімчына.

* * *

1. Сяўба соі. Сутнасьць прышчэпліваньня глебы пад сою ў тым, каб яна знашла ў глебе адпаведныя сабе бактэрыі. Прышчэпліваньне бактэрыяў робіцца гэтак: бярэцца жменя — другая зямлі з таго загону, дзе соя ўжо расла, разбаўляецца астыўшай пераваранай вадой на кашу і ў ёй перамешваюцца зярняты соі празначаныя да сяўбы. Замест гэтага, у пахмурную ці нават дажджлівую пагоду можна прышчэпліваную зямлю рассеяць беспасярэдна на поле прад пасевам і зараз-жа прыбаранаваць — бараной ці граблямі — каб перамяшалася

2. Як нішчыць шкодніка палёў—подтач? Апісываная Вамі зьвярынка, якую называеце подтачай, праўдападобна будзе кратаножкай (G r y l l o t a r p a v u l g a r i s). Барацьба з ёю ня лёгкая, бо з паложаных у м-цы чэрвені яец, подтачы вырастаюць аж праз тры гады. Трэба дзеля гэтага нішчыць як самую дасьпелую подтач так і яе яйкі. Дасьпелую подтач вытраўліваюць парай цечы Carboneum sulfuratum (CS_2), якую ўліваюць вясной (м-ц красавік) у ямкі паробленыя ў зямлі кіём на глыбіню 10 см. Замест гэтага ўжываюць яшчэ іншай сільнай труцізны — белага аршэніку, водным раствором каторага зэліваюць разваранае і расьцёртае зерне кукурузы, або ячменю, пшаніцы ці вымачанага гароху. Гэтак заатручаную прыманку ня можна пакідаць наверсе зямлі, а трэба яе закопываць у некалькіх мясцох да глыбіні 3—5 см. там, дзе заўважваецца сама подтач, або ейныя шкоды. На 8 кілё зерня ўжываецца 400 грам аршэніку і 200—300 літраў вады. — Апрача таго ловяць подтач у расстаўленыя ў зямлі роўна з берагамі вазоньнікі з роўнымі сьценамі: подтачы туды ўваліцца, і назад дастацца ня можа. — Знойдзеныя ў зямлі яйкі (дробныя, белыя) подтачы трэба нішчыць.

3. Сяўба проса. Проса — расьціна цёплага клімату і глыбокіх чарназёмных чыстых ад пырніку палёў. Не баіцца сушы, але баіцца прымаразкаў, хоць раней сеенае (май) заўсёды лепш вырастае. Спачатку расьце памалу і таму в. баіцца рознага пустазельля. Удаецца найлепш па гноеных акопнінах, а таксама па канюшыне, У гэтым апошнім выпадку трэба зямлю звосені двойчы (раз мелка і раз глыбака) пераараць. Сяўбу трэба байцаваць. На гэктар пад барану высяваецца 8—12 гарцаў (25—35 кілё), на глебах пульхных радзей, на зьбітых — гусьцей.

Засеенае — барануецца, а на сыпкіх грунтох і валкуецца. Вельмі ўдзячнае за пеліва і за раскрываньне сухой зямной скарынкі.

4. Абрываньне цьвету з бульбы. Агульнага для ўсіх рэцэпту на гэта няма. Аднаму ўдасца так, іншаму — гэтак. Зрабеце досьлед на сваім полі на чатырох (па дзьве) побач сябе паложаных барознах і аб выніках напішэце нам у рэдакцыю.

Б. К.

Гаспадарчая хроніка.

Земляробства загрожана пасьляжніўным спадкам і без таго нізкіх цэнаў на збожжа, каторага раптам аказалася вельмі шмат выкінена на рынак. А выкідаць яго наш земляроб мусіць, каб здаволіць сэквэстратараў, каторыя цяпер таксама вельмі налягаюць. У цэнтральных землях Польшчы Урад даўно ўжо скуплівае надвыжкі збожжа ў свае ссыпкі (Z.U.P.U.) і гэтым не дапускае, каб польскія сяляне выпрадавалі свае запасы „за гнілую рыбу". У нас-жа нічога такога ня чуваць. Ды яно і ня дзіва: сарочка да цела заўсяды бліжэй.

В ы в а з п р а д у к т а ў ж ы в ё л а г а д о ў л і. У ліпні м-цы вывезена заграніцу з Віленшчыны і Наваградчыны: 600 коняў, 12.000 скурак цялячых па 5.80 зл. за штуку на граніцы і каля 15.000 скур быдлячых. Апрача таго вывезена 1.204 кілё выробленай сьвінной шэрсьці (шчаціны) і 80.900 кілё шэрсьці пранай і ачышчанай. — Апрача таго вывезена жыўца: 30 штук бэконаў (па 85 кілё) і 40 кармнякоў (па 125 кілё).

В ы в а з г р ы б о ў. Паводле афіцыяльных падлічэньняў, з абшару Віленшчыны і Наваградчыны вывезена за м-цы чэрвень і ліпень с. г. 170.000 кілё сырых і 12.000 сушоных грыбоў.

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ.

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

Цэны у Вільні.

З збажжова-таварнай і льнярскай біржы у Вільні. 30.VIII.1933 г.

Цэны за 100 кілё тавару сярэдняй якасьці.

Цэны транзакцыйныя:

Жыта зьбіранае, новае . .	14.25—15.00.
Мука пшонная, 0000, А. люкс.	36.50—37.50.
Мука жытняя да 50 проц. .	25.50—26.00.
Мука жытняя да 65 проц. . . .	20.50.
Мука жытняя сітковая	18.00.
Крупы грэчненыя, 1/1 паленыя . . .	38.00.
Крупы грэчневыя, 1/2 паленыя . .	35.00.
Пансак ячменны № 2	24.00.

Цэны орыентацыйныя:

Пшаніца зьбіраная новая	21.00.
Авёс зьбіраны	12.50—13.00.
Мука пшонная, 0000, А. люкс.	36.50—38.25.
Мука жытняя разовая . . .	18.00—18.50.
Мука жытняя разовая шатраваная .	19.00.
Вотрубы жытнія	9.00.
Вотрубы пшанічныя ценькія . .	9.00—9.50.
Крупы грэчневыя 1/1 белыя	35.00.
Крупы аўсяныя	50.00.
Сена	5.50.
Салома	5.00.

Лён.

Базіс I ск. 216.50 за 1.000 кілё з дастаўкай на станцыю нагрузкі:

Лён трапаны Валожынскі	1.299.-—1.342.30
Лён трапаны Друйскі	1.104.15—1.147.45
Лён трапаны Докшыцкі	1.234.50 - 1.277.35
Кудзеля Гародзейская	1.158.28—1.179.93.

Агульны абарот у тоннах (у тонне ёсьць 1.000 кілё): 175.

Цэны прадуктаў малочных:

Масла найлепшае за 1 кіл. у гурце	2.70—2.80
„ „ „ „ „ „ „ „ у дэталю	3.10
Масла сталовае за 1 кілё у гурце	2.50—2.60
„ „ „ „ „ „ „ „ у дэталю	2.90
Масла соленае за 1 кілё у гурце	2.40—2.50
„ „ „ „ „ „ „ „ у дэталю	2.80
Сыры літоўскія за 1 кілё ў гурце	1.50—2.10
„ „ „ „ „ „ „ „ ў дэталю	1.80—2.40
Яйкі у гурце за капу	4.20— 5.40
„ „ „ „ у дэталю за штуку	8—10 гр.

ШУКАЕЦЕ ПРАЦЫ?

У Рэдакцыі «Самапомачы» ёсьць шмат адрэсоў беларусаў-спэцыялістаў з розных галін жыцьця. — Абавязкам кожнага беларуса ёсьць свае справы паручаць выконваць сваімжа людзям. Рэдакцыя «Самапомачы» прапануе і на далей свае ўслугі як для тых, хто гэткай працы шукае, так і для тых, хто з яе мусіць карыстацца.


На ўсякія запыты пісьмом трэба далучаць на адказ паштовую марку.

Рэдакцыя „Самапомачы.“

Управа **Беларускага Крэдытнага Коопэратыва** (б. Беларускі Кооп. Банк) ў Вільні гэтым паведамляе, што згодна з пастановай Нагляднай Рады і Управы Т-ва ад 5 жніўня 1933 г. і на падставе § 34 Статуту адбудзецца **Звычайны Агульны гадавы Сход** сяброў Т-ва **10 верасьня 1933 г.** у 3 гадзіны папаўдні, у памяшчэньні Т-ва (Вільня, Каралеўская 3—8). — **Парадак дня:** 1) Адчыненьне сходу і выбары Прэзыдыума Сходу; 2) адчытаньне пратаколу папярэдняга звычайнага Агульнага Сходу; 3) справаздача Управы аб дзейнасьці Т-ва за 1932 г.; 4) справаздча Нагляднае Рады; 5) адчытаньне пратаколу статутовае рэвізыі, 6) зацьверджаньне справаздачы, білянсу і р-ку зыскаў і стратаў за 1932 г.; 7) бюджэт расходаў і плян працы на 1933 год.; 8) справа зьмены рэгуляміну Фонду стыпэндыяў ім. Б. К. Б.; 9) выбары сяброў Нагляднае Рады і выбары кандыдатаў; 10) справа рэзэрвовага капіталу; 11) выбары Стыпэндыяльнага Камітэту; 12) бягучыя справы.

Управа.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.



CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ